БРЫЛЁЎСКІ ЛЕТАПІС

№ 22 (104)
ліпень
2009 г.

ІНФАРМАЦЫЙНА - ГРАМАДСКІ БЮЛЕТЭНЬ

Выдаецца з мая 2006 г.

Узмах буслінага крыла

с.4



КАМУНІКАТ.org

Свята с.3
Работа с.4
Выпускнікі с.5
Перад навальніцай с.6
Праблема с.8

З Юбілеем!

27 ліпеня
Валянціна
Ерамееўна
ЛУЖАНКОВА
адзначае
70-годдзе

21 ліпеня
Міхаіл
Іванавіч
ЧАРНЕГІН
адзначае
65-годдзе

12 ліпеня
Марыя
Іванаўна
АЗАРЭВІЧ
адзначае
50-годдзе

16 ліпеня
Людміла
Леанідаўна
БУРАЕВА
адзначае
35-годдзе

18 ліпеня
Алена
Аляксееўна
ГУЛАКОВА
адзначае
35-годдзе

З Днём нараджэння!

У ліпені нарадзіліся:

1 - Іваноў Аляксей Рыгоравіч
1 - Андрэйчыкава Вольга Лазараўна
6 - Халмоў Павел Міхайлавіч
10 - Меляшкова Наталля Анатольеўна
11 - Капылова Яўгенія Ціханаўна
12 - Паскакухіна Тамара Іванаўна
14 - Якушка Галіна Дзмітрыеўна
15 - Мажаева Валянціна Ягораўна
16 - Дудар Раман Васільевіч
18 - Іосіфава Лідзія Іванаўна
20 - Трухмінаў Антон Аляксандравіч
22 - Сцепчанкаў Іван Васільевіч
22 - Цымлякоў Канстанцін Генадзьевіч
23 - Чучуеў Аляксей Рыгоравіч
23 - Пухоўскі Андрэй Валянцінавіч
24 - Чарнегіна Таццяна Сіланцьеўна
24 - Смяшкоў Леанід Уладзіміравіч
27 - Паскакухіна Надзея Мікалаеўна
28 - Ярмаш Наталля Анатольеўна
30 - Ляутка Віктар Васільевіч

Віншуем!

5 ліпеня
Дзяніс
Уладзіміравіч
ІВАНОЎ
адзначае
25-годдзе

Мама, бабуля Люба і брат Максім
віншуюць
Антона Аляксандравіча
ТРУХМІНАВА
з юбілеем --
10-годдзем з дня нараджэння!



Образ на все времена

Исполняется 350 лет Барколабовской иконы Божией Матери.

Старожилы рассказывают, что после чернобыльской трагедии на Быховщине был довольно высокий радиационный фон. Однако место, где стоял некогда Барколабовский монастырь, оказалось абсолютно чистым. Факт этот вызывал недоумение исследователей. А вот жители окрестных деревень не удивлялись. Знали: в стенах бывшего монастыря долгое время находился образ, прославившийся многими чудесами. На поклонение ему стекались паломники не только православного вероисповедания, но и униаты, католики...

Барколабовская икона Божией Матери

По существующему преданию, икону подарил монастырю в 1659 году князь Пожарский, возвращавшийся с войсками из Литвы в Россию. И произошло это так. Когда отряд князя проходил мимо монастырских стен, спрятанный в военном обозе образ *«стал недвижим»* и никакие усилия не смогли сдвинуть его с места. Пожарский понял, что икона желает оставаться в монастыре, и передал святой образ игуменье.

Икона Пресвятой Богородицы пережила здесь войны XVII – XX столетий и все гонения на религию. После революции Барколабовский монастырь закрыли а позже и вовсе разрушили. Но местные жители смогли сохранить святыню до наших дней. Сейчас она находится в Свято-Троицком храме города Быхова в специальном пристенном киоте.

Барколабовская Одигитрия считается одной из самых почитаемых икон в Восточной Беларуси. Написанный темперой на хвойной основе с вызолоченным резным фоном образ являет собой величайший шедевр белорусской школы иконописи. *("Рэспубліка", 24.07.2009 г.)*

Узмах буслінага крыла

Гэта адбываецца штогод: ўвесну ў старое гняздо вяртаюцца буслы, а праз некаторы час адтуль пачынаюць чуцца галасы птушанят. І вось бусляняты ўжо ўглядаюцца ў вясковыя аколіцы з сваёй вышыні, паціху выбіраюцца з сутарэнняў гняздоўя, і аднойчы, узмахнуўшы не вельмі дужымі яшчэ крыламі, пачынаюць свой першы самастойны палёт. І неабсяжная нябесная прастора прымае маладыя сэрцы. А мы адсюль, знізу, глядзім на тыя ўпэўненыя ўзмахі, і нам робіцца неяк спакайней, бо ад жыццёвых нягод нас заўсёды захіналі, захінаюць і будуць захінаць белыя бусліныя крылы...

Агонь Купалля

Як заўсёды, ля купальскага вогнішча сабраліся вяскоўцы -- каб угледзецца ў чароўныя водбліскі, падумаць аб добрым і загадаць жаданні. І дай, Божа, каб тое імкненне ў будучыню спраўдзілася і каб усе патаемныя нашы жаданні не засталіся лёгкакрылай купальскай марай...

Умелыя рукі

Калі за справу бярэцца брылеўскі электрык Сяргей Мікалаевіч ЕРМАЛАЕЎ, можна быць упэўненым: усё будзе зроблена якасна і з вялікай душой.

Выпускнікі

А.Чубукоў, Т.Пшанічная і А.Жураў з пасведчаннямі аб заканчэнні школы.
5 ліпеня 2009 г.

Новы этап у жыцці наступіў у маладых брылёўцаў Аляксандра Чубукова, Таццяны Пшанічнай і Артура Журава -- яны атрымалі атэстаты аб сярэдняй адукацыі. Перад выпускнікамі развінаюцца шырокія шляхі жыцця і паўстаюць вялікія спадзяванні на тое, што будучыня будзе сонечнай і бязвоблачнай. І хочацца верыць, што былыя шкаляры добра ўсвядомілі, што за школьным парогам вучоба не скончылася. Бо жыццё будзе рэгулярна падкідваць новыя складаныя задачкі, і вядомая прымаўка "Век жыві -- век вучыся" зробіцца вельмі зразумелай...

А былыя выпускнікі Брылёўскай школы Юлія Яцкова і Крысціна Ляутка ў гэтыя дні яшчэ раз зрабіліся выпускнікамі -- Юлія скончыла Беларускі дзяржаўны Універсітэт культуры і мастацтваў у Мінску, а Крысціна атрымала дыплом магілёўскага музычнага вучылішча імя М.Рымскага-Корсакава.

Віншуем нашых выпускнікоў і жадаем ім усяго самага найлепшага!

Ю.Яцкова

К.Ляутка

Будынак Магілёўскага музычнага вучылішча імя М. Рымскага - Корсакава.

Навальніца хутка грымне...

Н.Ф.Рамашкевіч

Т.В.Лусцянкова

М.І.Лусцянкоў

Над суседнімі Раманавічамі неяк разам пацямнела неба, грукатнуў гром, і рэха Перуновых свавольстваў грымотным прадвесцем пранеслася над нашымі Брылямі. Толькі што было сонца, сушылася сена, а тут на табе -- навальніца на падыходзе!.. Надзея Фамінічна Рамашкевіч, схапіўшы граблі, імкліва падалася да сваёй сенажаці: трэба ж апярэдзіць непагадзь. Побач шпарка і засяроджана працавалі Тамара Васільеўна і Мікалай Ільіч Лусцянковы. І першыя кроплі ліпеньскага навальнічнага дажджу важка зашамацелі ўжо па акуратных сціртах хутка сабранага залаціста-духмянага сена...

Ала ЯЦКОВА.

Фотаздымкі М.Яцкова (8.07.2009 г.)

Мікола Яцкоў

* * *

Бурчыць тамбурынам
счарнелае неба --
ідзе навальніца.
Хвіліна -- і грымне!
Дай, Божа, бо -- трэба
напіцца й пазбыцца
спякоты бясконцай,
і зданяў падманных,
і смагі адвечнай...
А потым хай сонца
прысядзе на ганак
і скажа аб нечым.

* * *

Над Брылямі нізка-нізка
Бог Пярун на брычцы ехаў -
і была дарога слізкай,
і было нам не да смеху,
бо маланкі
білі ў ганкі
ля сасонкі залатой...
І вось так амаль да ранку
пёр Пярун на брычцы той.

БРЫЛЁЎСКАЯ БІБЛІЯТЭКА ІНФАРМУЕ

БЕЗОПАСНОСТЬ ВО ВРЕМЯ ГРОЗЫ

В большом городе нас защищает молниеотвод, по которому разряд безопасно уходит в землю. Но всё же с первыми раскатами грома безопасней выключить газ и все электроприборы. Да не просто выключить, а вынуть из сети вилку!

Не стоит во время грозы разговаривать по стационарному телефону, нельзя стоять рядом с окном, телеантенной, водосточной трубой. Если молния попадает в землю или объект, который расположен от вашего дома на 1500 м, то электрический разряд может дойти до вас.

Очень опасной остается сельская местность - почти все поражения молнией происходят именно там. В дачном или деревенском домике в грозу обязательно закройте окна, двери, дымоходы и вентиляционные отверстия. Не бегайте во время грозы. Нельзя растапливать печь - дым из печной трубы обладает высокой электропроводностью и способен притягивать молнию.

Опасней всего пережидать грозу на природе. Атмосферный разряд поражает прежде всего высокие отдельно стоящие и выступающие предметы. В поле ни в коем случае не прячьтесь от грозы под одиноким деревом, а в лесу - под самым высоким. Не прислоняйтесь к стволу, не беритесь за толстые ветви. Особенно опасно укрываться у одиноко стоящих столбов, геодезических знаков или просто на вершине высокого холма. Безопаснее отойти от них метров на 15 в низину.

Если гроза застала вас на открытом пространстве, лучше принять позу эмбриона - присесть, сгорбившись, на корточки. Если вы стоите прямо, ступни держите вместе. Влажная почва - хороший проводник электричества. Попадая в землю, заряд растекается по поверхности, а между расставленными ногами создается разность потенциалов, так называемое шаговое напряжение.

Снимите, выньте из карманов и отодвиньте на безопасное расстояние все металлические украшения, предметы, даже ключи. Они могут притянуть разряд. Опасно находиться в воде или поблизости от водоема - молнии часто ударяют в берега или в купальщиков.

Если гроза застала вас в автомобиле - вы в безопасности, так как металлический кузов служит защитным экраном, а резиновые шины - хороший диэлектрик. Закройте все дверцы и окна и переждите ненастье внутри. Выключите двигатель, радио, магнитолу, телевизор в салоне.

У всех принявших на себя удар стихии в месте входа и выхода разряда заметны так называемые знаки молнии. На теле вокруг них возникают древовидные светло-розовые или красные полосы, исчезающие при надавливании. Не теряйте времени на перенос пострадавшего в более подходящее место! Сразу делайте искусственное дыхание и закрытый массаж сердца до самого прибытия специалистов скорой медицинской помощи. Очнувшемуся счастливчику помогает согревание конечностей. На ожоги и другие повреждения до прибытия врачей накладывают стерильную (или хотя бы чистую) повязку. Пострадавшего обязательно госпитализируют! Известны случаи, когда жертвы грозы, выйдя поначалу из тяжелого состояния, через некоторое время погибали, поэтому необходим медицинский уход именно в больнице.

Цытата

"Сваім цярпеннем мы можам дабіцца большага, чым сілай"

Эдмунт Бёрк (1729 – 1797), англійскі публіцыст.

ЖЕРТВАМИ СТАНОВЯТСЯ ДОБРЫЕ

№ 18, 1993 г.

Таня познакомилась с Николаем два года назад и за это время из жизнерадостной, хорошенькой хохотушки превратилась в высохшую, измождённую истеричку. Психотерапевт Б.Буркин, не первый год занимающийся проблемами биоэнергетики, комментирует вышеописанный случай так:

-- Татьяна – типичный «донор», обладающий доброй, лучистой энергией, общалась с типичным «вампиром», который мог поддерживать своё существование, только высасывая энергию или жизненные силы у других людей. Действовал вампир скорее всего не сознательно, а интуитивно. И постоянные ссоры ему были нужны для того, чтобы плачущая Татьяна в эти минуты отдавала ему особенно много своей энергии.

К сожалению, избежать «вампиров» невозможно. В жизни их слишком много. Кто-то из них просто подсасывает нашу энергию в очередях, на работе и дома. А кто-то наделён просто демонической силой и аппетитом и может так «обескровить» свою жертву, что она погибнет. Всё зависит от характера и силы «вампиров» и от того, насколько мы можем сопротивляться им, не давать им возможности «пить нашу кровь».

Если вы чувствуете, что общение с каким-то человеком вам неприятно, что он вас утомляет или раздражает, -- это уже почти верный признак того, что перед вами «вампир». Прекратите всякое общение с этим человеком. Если же это невозможно, мысленно постройте между ним и собой непроницаемую стену и не поддавайтесь ни на какие провокации. Помните, что «вампирам» надо вывести вас из состояния равновесия, потому что они не могут пить жизненные силы тех людей, которые относятся к ним безразлично.

К сожалению, жертвами становятся обычно высоконравственные, добрые люди, излучающие свет и добро. Это-то и привлекает к ним «вампиров», которым можно и нужно сопротивляться, если мы, конечно, не хотим потерять жизненные силы, а иногда и саму жизнь.

Старонку падрыхтавала бібліятэкар Брылёўскай сельскай бібліятэкі Ала ЯЦКОВА

Прозвішча падпісчыка

Усё калгаснае - усё маё?

Работнікі лясной гаспадаркі, якія разбіраюць павалены лес ля Брылёў, ударна ўзяліся за работу. Усё б нічога, але нашы сябры-лесарубы паводзяць сябе так, быццам яны гаспадары не толькі ў сваім лесе, але і на навакольных землях. І ўзнікаюць тут новыя дарогі, а тыя дарогі, што былі, робяцца па шырыні як тыя шасціпалосныя аўтабаны. А гэта ўсё зямля, занятая ў сельскагаспадарчым абароце. Належаць палеткі фірме “Кадзіна”, і кіраўніцтва фірмы звярнула пільную ўвагу на праблему такіх адносін да сваёй уласнасці. Па словах начальніка аховы фірмы Мікалая Архіпавіча Шагойкі, у дачыненні да парушальнікаў у рамках існуючага заканадаўства будуць прымацца адпаведныя меры ўздзеяння. Калі спатрэбіцца, будуць і судовыя разборы.

М. ЯЦКОЎ.

Фотаздымкі аўтара.

Вось так з’яўляюцца новыя дарогі...

Усё шырэй і шырэй...

М. А. Шагойка (злева) высвятляе ў прадстаўніка лясной гаспадаркі акалічнасці ўзнікнення самавольнага склада бярвення ў вёсцы Качурына.



Складзены афіцыйны акт аб патраве сельскагаспадарчых культур.

“БРЫЛЁЎСКІ ЛЕТАПІС”
Инфармацыйна-грамадскі бюлетэнь.
Заснавальнік - М.А.Яцкоў
Выдаецца з мая 2006 г.
Распаўсюджваецца бясплатна.
Наклад 100 асобнікаў.

Адказны за выпуск -
Мікалай Адамавіч ЯЦКОЎ
На правах рукапісу.
Пры перадруку матэрыялаў
спасылка на “Брылёўскі летапіс” абавязковая.
© “Брылёўскі летапіс”, 2009

Звярстана і надрукавана
на ўласным абсталяванні.
Адрас: 213107 Магілёўскі раён, в.Брылі,
вул. Юбілейная 6 - 7
тэл. маб. +375293732886
e-mail: bryli@mail.ru